
Не пакідайце ж мовы нашай беларускай, каб не ўмёрлі!
ФРАНЦІШАК БАГУШЭВІЧ




Наша слова



Газета выходзіць з сакавіка 1990 года № 51 (686) 29 СНЕЖНЯ 2004 г.

З Новым 2005 годам!



Людзі Беларусі!

Грамадскае аб'яднанне "Таварыства беларускай мовы імя Ф. Скарыны" сардэчна віншуе ўсіх грамадзян краіны з любімымі зімовымі святамі: Нараджэннем Хрыстовым, Калядамі ды Новым 2005 годам.

Няхай гэты год прынясе ў наш агульны Беларускі Дом толькі добрыя перамены. Таварыства беларускай мовы наўпрост звязвае іх з беларускай мовай. Спадзяёмся, што ў наступным годзе праз мілагучнае роднае слова кожны адчуе сябе шчырым беларусам, адданым сваёй Бацькаўшчыне, а мова, дадзеная нам Богам, будзе паходняй на шляху вяртання да сваіх каранёў, да Беларушчыны.

Верым, што добры певень абудзіць усіх нас ад працяглага сну, а яго адметны голас натхніць на высакародныя справы, якія прынясуць у кожны дом дабрабыт, шчасце, радасць і жаданне жыць і працаваць на карысць сваёй Айчыны.

Са святам, дарагія беларусы!
Сакратарыят ГА "ТБМ імя Ф. Скарыны".

Тэлескоп № 200

Тэлескоп

Надзёманская краёвая газета

Газета выходзіць са снежня 1997 года № 13 (200) чацвер 23 снежня 2004 г.

У НУМАРЫ: 2 ст. Навіны Надзямоння | 3 ст. Навіны з усёй краіны | 4 ст. Этнаграфія, гумар | 5-8 ст. Тэлепраграмы і праграма Лідскага радыё

З Калядамі і Божым нараджэннем!

Вяртанне памяці

23 снежня, перад Калядамі пабачыў свет 200-ты нумар шматпакутнай газеты "Тэлескоп". Газета заснавана ў Лідзе ў 1997 годзе, чатыры разы прыпынялася (усе разы па эканамічных прычынах). Апошнія тры разы газета аднаўлялася, як беларускамоўная. І вось выйшаў 200-ты нумар газеты ў агульнай нумарацыі. Нажаль, эканамічны стан газеты так і застаецца далёкім ад цвёрдага і надзейнага, а разам з тым "Тэлескоп" на сёння адзіная недзяржаўная цалкам беларускамоўная газета ў Гарадзенскай вобласці.

Суцяшаць можа толькі тое, што калі ў "Тэлескопа" ёсць праблемы, то ён яшчэ жывы. Бо ў зачыненых газетаў праблемаў не бывае.

Наш кар.

З юбілеем, Вольга Міхайлаўна!



Алег Бембель,
інак Жыровіцкага манастыра

Ігуменьні пісьменнікаў Вользе

...Ты пастрыгала гераінь
Пакуль сваіх уласных твораў...
Цяпер сама – перад ЗАТВОРАМ
Спакусу сьвецкую пакінь...

І наш павернецца хаўрус
Да веры яснай –
Праваслаўнай...
І Богамудрасцю Дзяржаўнай
Хрыста ўславіць Беларусь...

Людміла Паўлікава

Вольга Міхайлаўна!

Дзе і якія Вас хаваюць далі,
Што не кажу падчас Вам, ці пішу?
Як песня, Вы ўзвышаеце душу,
Як мудрасць, Вы прыходзіце з гадамі.

Не веру я, што шчасце – забыццё,
Агонь жыцця -- адзінае багацце.
І можна толькі так здабыць жыццё –
Абараніць жыццё на перакаце

Эмілія Пасынкава

Акраверш
(Паводле "Вузялка Святагора")

Вольная думка не ведае межаў,
Іскрамі словы гараць на ляту,
Песня рыдае ў прасторы мяцежнай –
Адрас яе: Немаўля паратуй !
Тонкія ніці душэўнай нязгоды
Абагульняюць забытых дзяцей..
Воўны руно ахіне ад нягоды
Анельскім клопатам дбайных людзей.

Лілея Мялешка

ЗАГАДКА
Акраверш

Вольга Міхайлаўна, Вы мне—загадка.
Онікс і воск, і натхнення страла.
Льецца размова—над рэчкаю кладка.
Ь — мяккі знак сталасці, веры, дабра.
Гора ці радасць – на чым жа трымаецца
Астра надзеі ў Вашых вачах?

Існасцю мары хіба разгараюцца?
Плынню жыццёвай, дзе дух не зачах?
Аркай духоўнасці, ў водпаведзь ныцікам,
Тонкай і чыстай самотай сваёй.
Аўраю светлаю і мяккаю крытыкай
Вы — разам з мовай – не па-за палітыкай,
А – над палітыкай – над мітуснёй.

1 студзеня круглая дата ў жыцці слыннай беларускай пісьменніцы Вольгі Іпатавай. Пачаўшы, як паэтэса, Вольга Іпатава ўнесла найбольшы ўклад у скарбонку беларускай літаратуры як празаік гістарычнага жанру. У сваіх раманах яна стварыла выдатную галярэю вобразаў гістарычных дзеячоў нашай Бацькаўшчыны за розныя часы яе развою.

Сакратарыят ТБМ, рэдакцыя газеты "Наша слова" лічаць дзейнасць пісьменніцы Вольгі Іпатавай складовай часткай дзейнасці Таварыства і шчыра зычаць спадарыне Вользе яшчэ большага плёну на ніве Беларушчыны.

Сакратарыят ТБМ, рэдакцыя газеты "Наша слова".



№ 51 (686) 29 СНЕЖНЯ 2004 г. НАША СЛОВА

ЛЕТАПІС ТАВАРЫСТВА

Падрыхтавала Ірына Марачкіна

2001 год.

30 чэрвеня.

Магілёўская гарадская арганізацыя ТБМ разам з суполкай маладога фронту наладзілі сустрэчу з Анатолем Грыцкевічам і Алегам Трусавым, прымеркаваную да 60-годдзя гераічнай абароны горада ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Былі падведзены вынікі гарадскога конкурсу вершаў і сачыненняў "Мая радзіма — Беларусь".

Чэрвень.

Суполка сяброў ТБМ, што ў вёсцы М. Плотніца Пінскага раёну, у дзень Святой Тройцы зладзіла, як, дарэчы, і кожны год, свята роднай вёскі і роднай мовы.

1 ліпеня.

На паседжанні Рэспубліканскай рады ТБМ, якое адбылося ў дольнай зале Чырвонага касцёла прынятыя: пастанова "Аб парадку падпісання Дэкларацыі аб беларускай мове", Зварот да ўдзельнікаў у прэзідэнцкіх выбарах выкарыстоўваць беларускую мову ў сваёй агітацыі, уключаць у свае перадвыбарчыя праграмы патрабаванні аб статусе беларускай мовы, аб вяртанні нацыянальнай сімволікі, аб адкрыцці БНУ.

У тэатральнай зале Чырвонага касцёла, што на плошчы Незалежнасці ў Менску, ТБМ наладзіла вечарыну, прысвечаную 150-годдзю з дня нараджэння Янкі Лучыны. У дзень народзінаў паэта (6 ліпеня) сябры наведалі магілу пісьменніка, усклалі кветкі. З ініцыятывы ТБМ Міністэрства сувязі выпусціла маркаваны канверт да юбілею Янкі Лучыны.

11 ліпеня

У сталічным кінатэатры "Змена" ТБМ адзначыла 125-я ўгодкі Цёткі. Паказаны фільм "Крыж міласэрнасці", зняты па сцэнарыю Валянціны Коўтун.

23 ліпеня

Слонімская суполка ТБМ правяла конкурс сярод настаўнікаў, выхавальнікаў, бацькоў па напісанні ўласнай праграмы выхавання нацыянальна свядомай асобы. Пераможцай прызнана старшыня Слонімскай суполкі ТБМ Тацціяна Трафімчык.

23 жніўня

На сакратарыяце была прынятая Заява з нагоды спекуляцыяў у сродках масавай інфармацыі Беларусі вакол моўнага пытання падчас прэзідэнцкай выбарчай кампаніі.

(Працяг у наст. нумары.)

"Сакрэт" Вольгі Іпатавай

Шчасліваая наканаванасць лёсу Вольгі Іпатавай — нарадзіцца, узрастаць, духоўна сталець сярод слынных гістарычных мясцін Беларусі — Міра, Наваградка, Гародні з іх велічнымі старажытнымі замкамі, якія дыхалі нязведанай даўнінай і незвычайнай таямнічасцю. І найперш адсюль пачалі развівацца дзіцячыя, юнацкія ўяўленні, паэтычныя фантазіі будучай пісьменніцы пра тых людзей і падзеі, што тут адбываліся, хто будаваў і ўпрыгожваў гэтыя замкі, бараніў ад нападу ворагаў, тварыў гісторыю зямлі, якая стала і яе радзімай.

Аднак пачатак жыццёвага шляху быў не вельмі спрыяльным для Вольгі Іпатавай. І хоць нарадзілася яна ў пераможным 1945 годзе (якраз у ноч пад Новы год — 1 студзеня, у мястэчку Мір), але дзяцінства яе было азмрочана асабістай трагедыяй — у чатырохгадовым узросце яна страціла маці. Марыя Якаўлеўна памерла зусім маладой і пахавана на старажытных могілках у Навагрудку. (Пазней яе светлы воблік будзе ўвасоблены Вольгай у паэме "Слова пра маці" — 1971.)

У хуткім часе бацька адвёз дзяўчынку да бабулі ў вёску Забелле, што знаходзіцца ў Бешанковіцкім раёне. Дом Вольгі Іллінічны Белязека, у гонар якой Марыя Якаўлеўна назвала сваю дачку, стаў для асірацелага дзіцяці родным і ўтульным.

Так ад роднай зямлі і неба, дзіцячай памяці пра цеплыню "маміных далоняў", ад беларускага слова, казак бабулі, аповядаў дзядзькі Хведара пра партызанскую барацьбу, якой ён, як і ўся радня, былі ўдзельнікамі, дабрыні спагадлівых вясковых людзей — ад усяго гэтага першапачатковага пазнання свету пачыналася духоўнае сталенне, першыя жыццёвыя старты будучай пісьменніцы.

Пазней, у Гарадзенскім дзіцячым доме дзяўчынка рана адчула самастойнасць, навучылася разумець і пераадольваць цяжкасці, супярэчнасці паўсядзённага побыту і ўзаемаадносін людзей, сама вымушана была прабіваць дарогу ("Беды мучаць, ды розуму вучаць", — узгадае яна ў адным з апавяданняў бабуліну прыказку), што абумовіла ў далейшым шырыню агульна-мастацкіх інтарэсаў, прыхільнасць да нацыянальнай ідэі, актыўную грамадзянскую пазіцыю. Але галоўнае, у Гародні ёй пашчасціла сустрэць сапраўдных духоўных настаўнікаў, калі на яе вершы, якія яна пачала пісаць з адзінаццаці гадоў, звярнулі ўвагу Аляксей Карпюк, Васіль Быкаў, а таксама Янка Брыль, якому, як сябру бацькі "па партызанцы", яна пасылала свае літаратурныя досведы.

Першы верш ("Кітайскім сябрам") Вольгі Іпатавай быў апублікаваны ў газеце "Зорька" (1956). З таго часу вершы маладой паэтэсы пачалі пастаянна друкавацца ў "Гродзенскай праўдзе", пазней у часопісах "Бярозка", "Маладосць", "Беларусь", "Полымя", "Работніца і сялянка", газетах "Во славу Родины", "ЛіМ", "Чырвоная змена", "Голас Радзімы" і іншых выданнях.

Вольга Іпатава шчаслівa адгадала сваё прызначэнне. Богам дадзенае і выдатнымі творцамі падтрыманае пісьменніцкае дараванне рана праявілася і забруіла таленавітымі паэтычнымі і празаічнымі творамі, а плынь сірочага лёсу разам з духоўным сталеннем паступова ўваходзіла ў больш-менш спакойныя берагі самастойнага жыцця.

Пасля заканчэння універсітэта Вольга Іпатава пачала працаваць у Гародні. У снежні 1968 года ўпершыню загаварыла Гарадзенская студыя тэлебачання. Першай яе мастацкай перадачай стаў тэленарыс "Ластаўка", прысвечаны партызанцы з Любчы Людміле Сечка. І гэты нарыс зрабіла Вольга Іпатава — адна з чатырох першых рэдактараў тэлевізійнага вяшчання на Гарадзеншчыне.

На той час сама Вольга Іпатава была ўжо вядомай паэтэсай. У 1969 годзе выйшаў першы зборнік яе паэзіі з сімвалічнай назвай "Раніца", які сапраўды сімвалізаваў ранне яе пісьменніцкай творчасці.

Як паэт Вольга Іпатава сцвердзіла сябе і ў наступных зборніках лірыкі: "Ліпеньскія навальніцы" (1973), "Снягурка" (вершы для дзяцей, 1974), "Парасткі" (1976), "Крыло" (на рускай мове, 1976). Ужо самі назвы іх трапна вызначылі сэнс першапачатковага этапа яе творчасці, абумоўленага перажываннямі сіроцтва, але і адчуваннямі красы, непаўторнасці маладосці, якая пазнавалася "не розумам, а сэрцам", прарастала вершамі. Першае, што ўражвае пры іх прачытанні, — гэта лірычная настраёвасць, асабістасць, праўда пачуццяў.

І сапраўды, дарогі да пазнання свету, людзей, самой сябе, сталі пісьменніцкім скарбам Вольгі Іпатавай ("Якім жа знакам светлым і высокім // Гадзін маіх цяпер пазначан ход...").

Пазнаючы шматпакутную гісторыю Бацькаўшчыны, Вольга Іпатава адчувае сваю цесную знітаванасць з яе лёсам: "Я толькі кропля ў тваіх крыніцах..." Вочы і душа поўняцца пяшчотай да гэтай зямлі, што, знаходзячыся на перакрыжаванні вялікіх шляхоў, не раз вынішчалася дашчэнту:

А яна, непакорная,
усё паднімалася зноў,
Галавы не схіляючы
перад чужынцам ніколі,
І расціла, і ўкладвала
ў душы сыноў
Сваю прагу да шчасця,
да лепшае долі...

І можа, адсюль, з гэтай веры яе пастаянная цікавасць да гісторыі Бацькаўшчыны. Ужо ў ранніх вершах паэтэса звяртаецца да язычніцкіх часоў, адчувае, што не паміраюць старыя сімвалы, якім маліліся нашы продкі. ("Язычнікі маліліся ціха і ўпарта Чырвонаму Сонцу і Перуну..."), адкрывае для сябе постаці беларускай мінуўшчыны (вершы: "Рагнеда", "Усяслаў", "Полацкай Сафіі" — *"Чую звон твой, Сафія // Чую скрозь стагоддзі і скрозь муры..."*, *"Я шчаслівa наноў дыхаць ветрам стагоддзяў..."*), апісвае лёсы славутых беларускіх паэтаў ("Магіла Багдановіча", "Адам Міцкевіч у Тугановічах", "Міхасю Васільку"), захапляецца Камілай, дачкой Дуніна-Марцінкевіча ("Равесніцы"), асуджае тых, хто забывае сваю гісторыю, мову, вынішчае нацыянальныя святыні. Толькі далучанасць да гісторыі Радзімы, захаванне яе лепшых традыцый, пераемнасць іх новымі маладымі пакаленнямі дае адчуванне незалежнасці, упэўненасці ў заўтрашнім дні.

Яе стыхіяй стала вольнае пісьменніцкае слова, незалежна, дзе яно гучала — на тэлебачанні ці на старонках газет і часопісаў. У 1970 годзе Вольгу Іпатаву прынялі ў Саюз пісьменнікаў Беларусі. Рэкамендацыю ёй далі Васіль Быкаў, Данута Бічэль-Загнетава, Аляксей Карпюк. Як успамінае сёння Вольга Міхайлаўна, *"...той Саюз пісьменнікаў быў інакшы. Па-першае, ён быў меншы. І наўкол панавала атмасфера разумення, што пісьменнік і яго талент — гэта рэдкі дар, які трэба берагчы і ахоўваць. І з іншымі, і са мной працавалі, аберагалі. У 23 гады я атрымала сваю першую кватэру менавіта таму, што пісьменніца. Была ў Саюзе і нейкая асаблівая "вольніца", і павага да слова. Гэтаму шмат садзейнічалі тыя карыфеі літаратуры, якія былі для нас, маладых, з дзяцінства знаёмыя і вядомыя. Гэта Янка Маўр, Максім Танк, Янка Брыль, Іван Шамякін. Я з першага класа чытала іх вершы, апавяданні. Яны былі тады зусім маладыя па сённяшніх мерках. Але для мяне колішняй гэта былі жывыя класікі. Нават не ўяўляю сябе, каб маладыя маглі падумаць, што можна напісаць нешта абразлівае пра кагосьці з іх. Тое, што ў апошнія гады мы назіралі — цкаванне нашых лепшых літаратараў — гэта, па-мойму, дзікунства..."*


Вось такая атмасфера "вольніцы", павагі да беларускага слова і ягоных творцаў, якую адчула Вольга ў Саюзе пісьменнікаў, як бы замацоўвала тыя незалежніцкія імпульсы, атрыманыя маладой паэтэсай на самым пачатку творчага шляху. Яна адна з першых, яшчэ ў 70-я гады, выступіла ў абарону роднай мовы і нацыянальнага адраджэння.

Сёння, па меншай меры, смешна чытаць "глыбокадумныя" развагі савецкага гісторыка Л. Абацэдарскага пра аповесць "Прадыслава" ("Советская Белоруссия", 17 мая 1973), пра "князёўну-дэмакратку, імя якой заўсёды служыла рэакцыі, а не задачам камуністычнага выхавання моладзі". Да рэакцыянераў ім аднесены таксама Мелеці Сматрыцкі, Лаўрэнці Зізаній, іншыя вядомыя аветнікі мінулага. Аднак час разважыў па-справядлівасці. На сённяшні дзень "Прадыслава", іншыя гістарычныя творы Вольгі Іпатавай, выдадзеныя ў серыі "Школьная бібліятэка", якраз і служаць нацыянальнаму ўзгадаванню моладзі, расказваюць пра выдатных беларусаў, якія з'яўляюцца прыкладам самаадданага служэння радзіме і свайму народу. Да слова згадаць, сёння ў школах праводзяцца настаўнікамі-энтузіястамі беларускай мовы і літаратуры — урокі па творчасці Вольгі Іпатавай і яе аповесці "Прадыслава".

І сапраўды, кожны, хто прачытае "Прадыславу", адчуе глыбіні айчыннай гісторыі, да якіх пісьменніца толькі пачала падступацца. Ці варта падкрэсліваць, як важна ведаць нашу гісторыю цяпер, калі Беларусь зноў апынулася перад пагрозай страты незалежнасці. Сваёй аповесцю Вольга Іпатава яшчэ ў 70-я гады сцвярджала, што духоўнымі арыенцірамі нацыі павінны быць не ілжэгероі і не заваёўнікі, а людзі высокага маральнага вычыну і вялікай ідэі, як святая Еўфрасіння Полацкая — Асветніца, што запальвала сваімі справамі палачан, умела знаходзіць сярод іх таленты. І самае галоўнае — твор Вольгі Іпатавай абуджае цікавасць чытача да лёсу Прадыславы, а тым самым і да яе радаводу. А гэта ж амаль уся беларуская гісторыя, бо паходзіла Прадыслава з роду Рагвалода. Дачка яго — пакутніца Рагнеда, якая скончыла жыццё як манашка Анастасія, а пачынала яго як гордая князёўна, што не пажадала ісці замуж за кіеўскага князя Уладзіміра, бо не хацела "разуці рабыніча" (як вядома, маці будучага князя Уладзіміра была ключніца Малуша, рабыня княгіні Вольгі). У ліку продкаў Прадыславы быў таксама Ізяслаўкніжнік, сын Рагнеды, у чый гонар названа сённяшняе Заслаўе. Яе стрыечныя сёстры, дочкі Яраслава Мудрага (сына Рагнеды) былі каралевамі ў еўрапейскіх дзяржавах. Дзед яе, Усяслаў Чарадзей, магутны Полацкі князь, навечна застаўся самым вабным і таямнічым героем "Слова аб палку Ігаравым". І нічога дзіўнага, што дзяўчына са слаўнага роду князёў полацкіх таксама мела вешчую душу і рана адчула сваё прызначэнне. Яна запаліла сонца асветніцтва над беларускай зямлёй, адкрывала школы, храмы, вучыла дзяцей, перапісвала кнігі, заснавала багатую бібліятэку, спаленую, разрабаваную заваёўнікамі Івана Жахлівага. Па яе заказу таленавіты мастак-ювелір Лазар Богша стварыў непаўторны твор мастацтва — Крыж Еўфрасінні Полацкай. І яна — беларуская жанчынахрысціянка з тых святых праведнікаў, што ў свой час уплывалі на духоўную атмасферу і народную самасвядомасць, была кананізавана і стала Святой Еўфрасінняй — сімвалам і апякункай нацыі. Сёння ў Полацкі Свята-Еўфрасінеўскі манастыр ідуць і едуць людзі, каб пакланіцца і памаліцца ей памяці. Дык ці не была "Прадыслава" Вольгі Іпатавай у гады, калі мы жылі пад прэсінгам крайне неспрыяльных для нацыянальнага адраджэння абставінаў, своеасаблівым пратэстам і адначасна прарывам у далёкую беларускую гісторыю?

На лепшых традыцыях сусветнай і беларускай літаратур пабудаваны празаічныя творы Вольгі Іпатавай. Некалі Б. Пастэрнак сказаў, што сапраўдная паэзія — гэта проза. Шматгадовая плённая праца ў жанрах паэзіі, нарыса, перакладчыцкая дзейнасць, творы для дзяцей, і логіка пошукаў, безумоўна, паспрыялі таму, што пісьменніца асноўныя свае намаганні пачынае скіроўваць на прозу, якая дае кожнаму мастаку шырокую прастору для ўвасаблення жыццёвых праблем і рэалій сучаснасці, падзей далёкай і блізкай гісторыі.

У 1977 годзе выходзіць першая кніга прозы "Вецер над стромай" (Мінск, "Мастацкая літаратура"), куды ўвайшлі і першыя аповесці "Вецер над стромай" і "Прадыслава". Гэта, можна сказаць, быў празаічны дэбют пісьменніцы, імя якой як паэта, публіцыста было ўжо шырока вядомым не толькі на радзіме. Іпатава-празаік пачынала традыцыйна, як і іншыя пісьменнікі, з малой празаічнай формы — апавядання, але амаль адначасова пісала і аповесці, што сведчыла аб упэўненым аваладанні сакрэтамі эпічнага майстэрства. Прычым, "Вецер над стромай" і "Прадыслава" — гэта зусім розныя эпохі, розны жыццёвы матэрыял, які аказаўся аднолькава падуладным яе пяру. Яна па-мастацку разгортвае сюжэтныя лініі, займальныя калізіі, акрэслівае кола дзейных асоб, вызначае характары, не баіцца звяртацца да вострых праблем і непажаданых у тыя часы тэм, яскрава выказаць сваю аўтарскую пазіцыю да ўчынкаў і паводзін сваіх герояў.



“Сакрэт” Вольгі Іпатавай

Выразна аўтабіяграфічнымі момантамі пазначана і выдатная аповесць Вольгі Іпатавай "Вузялок Святагора", па якой, дарэчы, у 1988 г. быў пастаўлены мастацкі фільм "Гумункулус". Аповесць разам з апавяданнямі ("Цана", "Апоўначы, калі б'юць куранты", "Спасціжэнне", "Авантура", "Фарфоравая маладая", "Перакат", "Позні канцэрт", "Шакаладка", "Хата з блакітнымі аканіцамі", "Нявеста", "Дваццаць хвілін з Немезідай") была змешчана ў другой кнізе прозы Вольгі Іпатавай "Дваццаць хвілін з Немезідай", якая выйшла ў выдавецтве "Мастацкая літаратура" ў 1981 г. Тэма аповесці (напісана напачатку 80-х) — жыццё дзетдомаўцаў — актуальная і ў наш час. Тут памяць пра ўласнае дзяцінства цесна звязана з роздумам аўтара над сацыяльнымі і маральнымі праблемамі існавання грамадства, дзе на сённяшні дзень не ўбывае, а, наадварот, павялічваецца колькасць дзяцей-сірат, і, што самае парадаксальнае, пры жывых бацьках. У аповесці паўстае і тэма станаўлення асобы — адна з асноўных наогул у творчасці пісьменніцы.

Ужо на раннім этапе яе выспявала задума — давядаца самой і расказаць у творах, што было з нашай зямлёй у мінулым. Так быў напісаны цэлы цыкл апавяданняў пад агульнай назвай "Гул далёкіх стагоддзяў". Некаторыя з іх ("Ваўкалакам абярнуся", "Пад нагамі нашымі", "Святаслава", "Расанка", "Набег", "Песня маці") змешчаны ў трэцяй кнізе прозы "Перакат", выдадзенай у 1984 годзе. Пазней былі напісаны: "Гайна і Мікаш", "Мара", "Давыд Гарадзенскі". Усе гэтыя творы ў жанравых адносінах уяўляюць сабой невялікія падзейныя навелы, у аснову якіх пакладзены эпізоды з жыцця вядомых гістарычных асоб: Рагвалода, Усяслава, Давыда Гарадзенскага, славутага военачальніка, які вадзіў войска Вялікага княства Літоўскага на крыжакоў, раскрываюцца моманты побыту, звычаяў, вераванняў простых людзей, якія ўсё яшчэ маліліся паганскім багам і жыццё і якіх цалкам залежала ад улады князёў. У невялікай навеле "Ваўкалакам абярнуся" аўтар расказвае пра цяжкі лёс паэта Паўлюка Багрыма, тыя моманты з яго сталага жыцця, а рэтраспектыўна. праз яго ўласныя ўспаміны і пра маладыя гады, калі ён, пасля дваццаць пяці гадоў службы ў царскім войску, вярнуўся ў Крошын, збудаваў хату, узяў маладую жонку, але не было спакою на душы, не мог ён болей пісаць вершы, бо змярцвела душа ад панскіх здзекаў, жудасная салдатчыны, і ўспаміны пра ўсё гэта забівалі натхненне. Аднак усе апавяданні гістарычнай тэматыкі, ранняя аповесць "Прадыслава" былі толькі подступам пісьменніцы да больш грунтоўных твораў пра мінулае Бацькаўшчыны.

Вось што пісаў пра яе прозу Васіль Быкаў у прадмове да зборніка "Вецер над кручэй"(выдавецтва "Молодая гвардия", 1980 г.): "Проза В. Іпатавай – тварэнне прыроджанага празаіка, хоць шлях да яе ляжаў раз юнацкае захапленне паэзіяй.

Каб пераканацца ў гэтым, дастаткова прачытаць некалькі апавяданняў са зборніка, даволі разнастайных па тэматыцы, але, як правіла, родных паміж сабой значнасцю канфлікта і сапраўдным драматызмам жыццёвых абставін. Наогул, драматызм заўсёды прысутнічае ў прозе В. Іпатавай — ідзе размова пра жаночы лёс і каханне, піша яна пра дзяўчынку-сірату ці расказвае пра невылечна хворага хлопчыка, прыкаванага да бальнічнага ложка. Найбольш пераканаўчыя абставіны і характары, а таксама сітуацыі, вынесены аўтарам з пражытага, пацверджаны жыццёвым вопытам пісьменніцы...

Тэматычная шматстайнасць жыццёвага матэрыялу, які стаў асновай для празаічных твораў В. Іпатавай, сведчыць пра шырыню яе творчага пошуку, што наогул натуральна і правамерна для маладога празаіка. Адзначу, дарэчы, што Іпатава амаль у роўнай ступені ўмее пісаць пра горад і пра вёску, умее ствараць характары як дарослых, так і малады людзей, звяртаючы пісьменніцкую ўвагу на галоўным прадмеце мастацтва — чалавеку і яго псіхалогіі...

Імкненне да паглыбленага псіхалагізму ў адлюстраванні многіх герояў апавядальнай плыні — адна з самых прывабных якасцяў аўтара, таксама як і яе даволі спелае ўменне "маляваць словам", ствараць лапідарныя, але выразныя і змястоўныя карціны прыроды. Проза В. Іпатавай насычана колерамі, рухам, пахамі. На старонках зборніка рассыпана нямала яркіх, запамінальных дэталяў, народных выразаў, трапных слоў, усё гэта моўнае, выяўленчае багацце падмацоўваецца нетаропкай, без афектацыі і пераціскаў аўтарскай інтанацыяй, за якой адчуваецца чалавек, узбагачаны жыццём і надзелены ад прыроды чулай і добрай душой.

Чытач не можа не паверыць таму, пра што прачытае ў гэтай кнізе, і наўрад ці застанецца абыякавым да трывог і клопатаў многіх з яе герояў.

А гэта, відаць, самае галоўнае для кожнага сумленнага аўтара".



І усё ж, галоўная творчая ўдача Іпатавай-празаіка — яе гістарычныя аповесці і раманы.

Пасля "Прадыславы", якая сталася тым грунтам, на якім будаваліся наступныя гістарычныя рэчы пісьменніцы, выходзіць аповесць "Агонь у жылах крэменю", дзе пісьменніца звяртаецца да балюча актуальных у мінулым і сучасным жыцці беларусаў праблем веравызнання і еднасці нацыі. Аповесць адлюстроўвае тыя моманты ў існаванні Вялікага Княства Літоўскага, калі для яго з боку Рэчы Паспалітай пачала ўзнікаць небяспека паланізацыі, калі разгарнулі сваю дзейнасць езуіты з мэтай прымусовага акаталічвання насельніцтва. Вядома, у аснову твора, як, да слова, і іншых гістарычных рэчаў, пакладзены дасканала вывучаныя дакументы і матэрыялы, аднак тут выразна адчуваецца і ўласнааўтарскае бачанне, разуменне гэтых складаных праблем з пункту гледжання дня сённяшняга.

Калі папярэднія аповесці уяўляюць сабой панараму XVI стагоддзя, то ў рамане "За морам Хвалынскім" пісьменніца ідзе ў яшчэ больш аддаленую эпоху. Дзеянне рамана адбываецца ў XI стагоддзі, у часы полацкага князя Брачыслава, калі яго сын Усяслаў, якога народ празаве Чарадзеем, быў маладым княжычам. Але галоўны герой тут не ён, а сын каваля Алекса, аднагодак Усяслава, які ні ў чым не ўступаў маладому княжычу — ні ў сіле, ні ў розуме. Ясным, добрым святлом вее ад першых старонак твора, аўтар адразу ўводзіць нас у кола клопатаў простых людзей і княжацкага двара, дынамічна разгортвае змест рамана, які захапляе ад першай да апошняй старонкі. І гэта вельмі важная ўласцівасць творчай манеры Іпатавай-празаіка, уменне будаваць напружаны сюжэт, захапіць чытача вострымі калізіямі, лёсам сваіх герояў. Нездарма на сённяшні дзень раман "За морам Хвалынскім" вытрымаў шэсць выданняў.

Затым выходзіць трылогія "Залатая Жрыца Ашвінаў", Вяшчун Гедзіміна" і "Альгердава дзіда". Гэтыя творы былі напісаны Вольгай Іпатавай на працягу пяці гадоў (1997—2001). Раман "Залатая жрыца Ашвінаў" друкаваўся спачатку ў "Полымі" (1997, № 10—11; 1998, № 6—7), асобным выданнем выйшаў у 2000 г. (на рускай мове, пераклад Ірыны Качатковай). У новым рамане пісьменніца звяртаецца да падзей XIII стагоддзя, перыяду стварэння беларуска-літоўскай дзяржавы, пачатку старажытнага Навагрудка, калі там княжыў Міндоўг, закладваліся муры Навагрудскага замка і побач з хрысціянствам існавалі паганскія вераванні нашых далёкіх продкаў. Гэты перыяд, слаба асветлены ў навуковых даследаваннях і гістарычных хроніках (згадваюцца хіба навуковыя працы Язэпа Дылы "Месца беларусаў сярод тубыльцаў Усходняй Еўропы", "Прааўчына славянаў і іх рассяленне", "Мінулае Беларусі", ягоны раман "На шляху з варагаў у грэкі", дзе апісваюцца падзеі дахрысціянскіх часоў і пачатак пранікнення на старажытныя славянскія землі хрысціянства, а таксама падарожжы ў чужыя далёкія краіны), замежных і айчынных, апошнім часам знайшоў сваё адлюстраванне ў такіх мастацкіх творах як "Жалезныя жалуды" Леаніда Дайнекі, "Кліч роднага звона" Генрыха Далідовіча, "Пахаджанне і радавод вялікіх князёў літоўскіх" Вітаўта Чаропкі. У рамане "Залатая жрыца Ашвінаў" Вольгі Іпатавай упершыню ў беларускай літаратуры раскрываюцца тыя моманты, як наваградская зямля станавілася цэнтрам Вялікага Княства Літоўскага і канкрэтна, якія адбываліся пры гэтым падзеі ў часы Міндоўга і Войшалка, што сабой уяўляў Навагрудак і яго наваколле, якая барацьба вялася паміж суседнімі княствамі. Дзеянне рамана разгортваецца якраз на мяжы ўмацавання хрысціянства і глыбіннага бытавання паганства. Агульнавядома, што хрысціянства прыйшло на ўсходнія землі ў X, а на беларускіх землях яшчэ ў XIII стагоддзі жыло двухвер'е, адчуваўся моцны ўплыў язычніцтва, што ішло ад старажытнаіндыйскай рэлігіі, ад вераванняў індаеўрапейцаў, якія прыйшлі ў Еўропу з Азіі. Браты-блізняты Ашвіны, што згадваюцца ў "Рыгведзе", культ блізнят — вызначальная рыса старажытнаіндыйскай арыйскай цывілізацыі, і гэты культ спаваўся ў славян, балтаў, германцаў, іншых народаў. Язычніцкія багі Ашвіны, якім пакланяліся нашы далёкія продкі, абрады, малітвы перайшлі да іх ад арыяў. Пакланенне гэтым добрым, спрыяльным чалавеку багам-блізнятам на беларускіх землях быў вельмі моцным якраз у той перыяд, які апісваецца ў рамане.

Другая сюжэтная лінія твора звязана з вядомымі гістарычнымі асобамі, найперш князем Міндоўгам, умацаваннем яго свецкай улады. Гэты гістарычны пласт рамана, насычаны змястоўнай інфармацыяй, не быў бы такім цікавым, калі б пад пяром пісьменніцы не ажыла эпоха ва ўсёй шматграннасці тагачасных рэалій.

Новыя раманы пісьменніцы "Вяшчун Гедзіміна", "Альгердава дзіда" з'яўляюцца своеасаблівым храналагічным працягам рамана "Залатая жрыца Ашвінаў". І не толькі таму, што падзеі беларускай гісторыі ў іх асэнсоўваюцца з пункту гледжання сённяшняга разумення нацыянальнай ідэі, прыхільнасць да якой Вольга Іпатава выказала даўно і незваротна і яе аўтарскую інтэпрэтацыю мы цалкам падзяляем. Галоўнае, у раманах чытач не толькі адчувае вольналюбівы дух Жывені-Еўфрасінні, але і сустракаецца праз многія гады з ёй самой — мудрай, пастарэлай захавальніцай беларускага роду. Паўстаюць, як і ў першым рамане, многія рэальна існаваўшыя гістарычныя асобы, старажытныя беларускія гарады, ажываюць язычніцкія багі, розныя міфічныя постаці, якія доўгія стагоддзі суіснавалі побач з нашымі продкамі: Пярун, Ярыла, Вялес, Дажджбог, Дзявоя, Стрыбог, Судзеніца, Жыжаль, Зюзя, Мара, Лада, Трасца, Лядашчык... Пісьменніца працягвае далей, на новым вітку гісторы даследаваць канфлікт паміж паганствам і хрысціянствам, раскрываць іх ідэйныя, культавыя, міжканфесійныя разыходжанні, схіляючыся да сцвярджання неабходнасці мірнага суіснавання ў нашай краіне розных культур і рэлігій — у чым зноў жа адчувальная паралель з днём сённяшнім.

Завяршаецца гістарычная трылогія Вольгі Іпатавай пра Вялікае Княства Літоўскае і яго валадароў раманам "Альгердава дзіда". У гэтым творы-працягу "Залатой жрыцы Ашвінаў" і "Вешчуна Гедзіміна" дзейнічаюць ці згадваюцца адны і тыя ж героі ў той жа гістарычнай і часавай прасторы. Аднак у цэнтры — галоўны герой Альгерд — адзін з самых любімых і разумных сыноў Гедзіміна, які шмат пераняў ад бацькі гаспадарчых, воінскіх, дыпламатычных талентаў. У беларускай літаратуры гэта адзін з першых твораў пра выдатнага гістарычнага дзеяча (яму некалі яшчэ Ян Чачот прысвячаў свае вершы), імя якога амаль незнаёма звычайнаму чытачу. А менавіта Альгерд, народжаны на злёце трынаццатага стагоддзя, у 1296 годзе, за сваё доўгае жыццё (а пражыў ён 81 год і памёр у 1377) шмат ваяваў з тэўтонамі, памнажаў багацце і землі Вялікага Княства, дзе асноўным ядром былі беларусы з іх самастойнай культурай, будаваў замкі і праваслаўныя храмы. Гэта пры ім Княства стала вялікай дзяржавай, ад Балтыйскага да Чорнага мораў. У Кіеве княжыў ягоны сын Уладзімір, у Пскове сын Андрэй, а Ягайла стаў польскім каралём. Гэта Альгерд са сваім войскам у цяжкай бітве перамог татараў на рацэ Сініх Воды (прыток Паўднёвага Буга). Гэта быў складаны пераходны час суіснавання старога язычніцкага светаўспрымання з новым, хрысціянскім, час змагання за пашырэнне і зберажэнне вялікай дзяржавы.

Шырокаму чытачу прысвечана і такая яе кніга як "Паміж Масквой і Варшавай". (Некалькі гістарычных маршрутаў Беларусі), якую таксама можна аднесці да гістарычных твораў. Кніга выдадзена ў 1996 годзе на беларускай і нямецкай мовах. Шмат бываючы за межамі радзімы, сустракаючыся з многімі людзьмі, Вольга Міхайлаўна ўпэўнілася, што "Беларусь у свеце калі і ведалі, то ў асноўным як партызанскую рэспубліку, але тысячагадовай яе гісторыі нібыта і не існавала. Вось чаму, адклаўшы ўсе справы, аўтар узялася хаця б вельмі сцісла расказаць пра некаторыя нашы гарады з іх даўняй і цікавай гісторыяй, аднавіць вобразы славутых людзей нашай зямлі, звязаных з тымі ці іншымі мясцінамі, апісаць найбольш самабытныя этнаграфічныя абрады — словам, накідаць партрэт той Беларусі, якою можна ганарыцца любому народу...

(Заканчэнне на ст. 4.)

"Сакрэт" Вольгі Іпатавай

(Заканчэнне. Пачатак на ст. 3-4.)

Зямля між Масквой і Варшавай, таямнічая Беларусь, пра якую так мала ведаюць на Захадзе... Краіна гэтая насіла розныя імёны — то Крывія, то Полацкая зямля, то Вялікае Княства Літоўскае, Рускае і Жамойцкае (ці Літва), то, нарэшце, Беларусь. Дзве вялікія дзяржавы пастаянна ўцягвалі яе ў сферу свайго ўплыву, вялі за яе войны. За стагоддзі яна страціла свае культурныя цэнтры — Смаленск і Вільню (сучасны Вільнюс)... У песнях яе называюць сінявокай з-за мноства сініх азёраў і рэчак, якія навекі адлюстраваліся ў вачах людзей, што жывуць тут. У легендах яе называюць Белай Руссю — з-за белай, з кужэльнага лёну старажытнай вопраткі жыхароў. А можа з-за белых буслоў, што так любяць сяліцца ў яе вёсках і мястэчках? Праўда, у народзе лічаць, што буслы прыносяць шчасце, а шчаслівага, спакойнага жыцця на гэтай зямлі было мала... Бо яна ўся — раздарожжа... Але, нягледзячы на бясконцыя войны, якія ішлі скрозь нашу зямлю, знішчаючы на ёй усё, што паспявалі стварыць і будаваць, Беларусь дала свету шмат таленавітых людзей... Памяць народная захоўвае вобразы сваіх герояў, і калі нават яны перайшлі ў міфалогію, то храбрасць і паэтычнасць іх засталіся ў імені — Вярнідуб, Світальнік, Попельнік... Апошняе — таму, што гэты народ пасля ўсіх войнаў адраджаўся літаральна, як Фенікс, — з попелу... Беларус любіць зямлю, ён урос у яе карэннямі, усёй сваёй істотай. І калі тое, што было на паверхні, — Жывое Дрэва Жыцця, якое ёсць у кожнага народа, было спалена, — то карэнні захаваліся, жывуць. Вось чаму, нягледзячы на тое, што беларуская мова ў канцы ХХ стагоддзя засталася невялікімі астраўкамі пасярод суцэльнага мора русіфікацыі,— адраджэнне яе, уласнай культуры і гісторыі збіраецца сёння па драбочку..."

Гісторыю Беларусі Вольга Іпатава асвятляе не толькі ў раманах, аповесцях, апавяданнях, публіцыстычных нарысах, прысвечаных старажытным гарадам і мястэчкам, але выкарыстоўвае і такі жанр, як опернае лібрэта, сцэнарыі. Яшчэ ў 1988 годзе па сцэнарыю пісьменніцы быў пастаўлены на тэлебачанні міні-спектакль "Давыд Гарадзенскі" (рэжысёр Надзея Гаркунова). Тады ўпершыню ў нашу літаратуру ўвайшлі вобразы Давыда Гарадзенскага і ягонай жонкі, прыгажуні Біруты — дачкі Гедзіміна. Сцэнарый заканчваўся на аптымістычнай ноце — Давыд і Бірута гавораць пра каханне і адухоўленыя гэтым глыбокім пачуццём яны адыходзяць у вечнасць. (Дарэчы, вобраз Давыда Гарадзенскага першым адкрыў гісторык Міхась Ткачоў).

Напачатку 90-х у Беларускім оперным тэатры з поспехам прайшла опера "Князь Навагрудскі", лібрэта для якой напісала Вольга Іпатава па п'есе Л. Пракопчыка (кампазітар А. Бандарэнка). У гэту літаратурную першаасноу оперы пісьменніца ўклала ўсю душу, раскрываючы для тэатральнага гледача цікавую і слаўную старонку нацыянальнай гісторыі. Перад намі ў "Князю Навагрудскім" разгортваецца гістарычная эпапея, якая замацоўвае ў нашай свядомасці думку пра тое, што беларуская зямля можа ганарыцца не толькі сціплымі, працавітымі сялянамі, але і высока адукаванай нацыянальнай інтэлігенцыяй, талентамі, героямі, палкаводцамі, лепшымі прадстаўнікамі шляхетных родаў, іх здзяйсненнямі, якія належыць, як любому цывілізаванаму народу ведаць і шанаваць.

Калі з вышыні сённяшняга дня агледзець здзейсненае Вольгай Іпатавай, то выразна акрэсліваецца нацыянальна-патрыятычная праблематыка яе творчасці, дзе няма ніякай даніны ідэалагічным устаноўкам савецкага часу. Жыццё глыбіннай Беларусі, яе простых людзей, якія заўсёды жылі нялёгка, але кіраваліся агульначалавечымі, агульнахрысціянскімі законамі, не выракаліся сваіх адвечных традыцый, выпрацаваных бацькамі і дзедамі — менавіта з гэтых высокадухоўных пазіцый зыходзіць пісьменніца, раскрываючы ў сваіх аповесцях, апавяданнях, раманах сучаснае і далёкае мінулае Бацькаўшчыны. У адным з крытычных артыкулаў, прысвечаных Уладзіміру Караткевічу, Вольга Міхайлаўна, нязменная паслядоўніца яго творчасці, пісала: "І якія толькі вобразы не ўспліваюць з глыбіняў часу, выкліканыя адтуль яркім і багатым талентам Уладзіміра Караткевіча! Пракрокі і мужыкі, інтэлігенты, якія шукаюць сябе і сваю гісторыю, чароўнай прыгажосці дзяўчаты і кардыналы, рыцары і прыгоннікі, паўстанцы і змагары. А за імі, праз іх — эпоха, Беларусь, складаны і часам трагічныя яе лёс, народ, што прагне волі і долі, што не дае ўціску і галечы завалодаць сабой, загасіць у душах прыгажосць і сілу духу..."

Сёння мы можам тое самае сказаць і пра яе творы, дзе ажываюць дзеячы слаўнага беларускага мінулага, што тварылі нацыянальную гісторыю, якой можа ганарыцца любая еўрапейская краіна. Вядома, што нашым дзеячам заўсёды цяжка даводзілася змагацца за беларускія справы, і з гэтымі цяжкасцямі мы ўступілі і ў новае стагоддзе. Апошнім часам Вольга Іпатава шмат піша публіцыстычных артыкулаў, якія можна аб'яднаць агульнай назвай: "Трывога точыць сэрца". Так называўся цыкл яе публіцыстычных эсэ, апублікаваных у газеце "Звязда" (2000, 26 жніўня, 20 верасня), якія былі звернуты не толькі да чытачоў газеты, але і да ўсіх, хто заклапочаны лёсам беларушчыны, нацыянальнай гісторыі і культуры, роднай мовы.

Яна і сёння пастаянна піша публіцыстыку, якая друкуецца цяпер толькі на старонках "Народнай волі" і ў "Нашым слове", бо занадта вострым для ўлады можа быць у сённяшніх умовах слова сапраўднага пісьменніка.

І ў гэтай пастаяннай працы, у пошуках, у новым – сакрэт пастаяннага поспеху Вольгі Іпатавай у чытача, які піша ёй, робіць па ейнай творчасці дыпломы і дысертацыі, прысвячае вершы. Многія вершы – прысвячэнні (Р. Барадуліна, А. Вярцінскага, Л. Паўлікавай і ін.) ужо былі ў друку. Таму да артыкулу рэдакцыя "Нашага слова" папрасіла мене дадаць тыя творы пісьменнікаў, якіх у друку яшчэ не было. Хай яны сведчаць аб той павазе, якою карыстаецца пісьменніца, якую нездарма называюць "гонарам сваёй нацыі." *(Вершы чытайце на ст. 1.)*

Лідзія Савік.

На 80-м годзе жыцця ў Магілёве памёр

Валянцін Ермаловіч,

малодшы брат Міколы Ермаловіча, актыўны сябар ТБМ, стваральнік беларускіх народных тэатраў на Магілёўшчыне.

Сакратарыят ТБМ выказвае шчырыя спачуванні родным і блізкім нябожчыка.

Станіслаў Суднік

З БЕЛАРУСКАЙ МОВАЙ ПА ЖЫЦЦІ

(Працяг. Пачатак у папярэдніх нумарах.)

Так вось непрыкметна я дабраўся да яшчэ аднаго перыяду ў сваім жыцці - цвярскога. Ці то згадваў ці то не, але ў акадэмію я паступіў у 1988 годзе, паступіў на завочны факультэт. Да сёння не ведаю, чаму мяне тады адпусцілі паступаць, бо раней не пускалі. І вось тут мне зноў добрую службу паслужыла беларуская мова. У акадэміі перад выклікам на здачу экзаменаў ёсць так званы конкурс асабістых справаў, прынамсі, быў у савецкі час. Паводле гэтага конкурсу асабістых справаў усе, хто хоць крыху выклікаў сумненне ў палітаддзела, асобага аддзела, на ўступныя экзамены проста не выклікаліся. У прыёмную камісію акадэміі акрамя іншых уваходзілі начальнікі ўсіх факультэтаў, у той год уваходзіў начальнік 1-га факультэта, мой былы камандзір палкоўнік Цацяратнікаў.

Завочнікаў разглядалі ў канцы. Цацяратнікаву ці то сядзець надакучыла, ці справы якія былі, і ён вырашыў пайсці. І вось ён пацікy рухаецца да дзвярэй і краем вуха чуе: "... ведае дваццаць моваў, але выклікаць не будзем - паляк". Цацяратнікаў спыніўся: "Хто ведае дваццаць моваў?" "Ды Ваш былы падначалены, маёр Суднік, але выклікаць не будзем, бо ён паляк." Ну, тут Цацяратнікаў стаў на дыбы. "Які ён вам паляк? Ён - самы чыстакроўны беларус, ён адзін на палігоне па-беларуску гаворыць."

Аўтарытэт у Цацяратнікава ў акадэміі быў, але, мусіць, не зусім дастатковы для вырашэння майго пытання. Мне выклік на ўступныя экзамены прыйшоў, але пасля прыезду ў акадэмію я высветліў, што ні ў якіх спісах мяне няма, ніхто мяне тут не чакае. Мне дазволілі патэлефанаваць Цацяратнікаву, ён умяшаўся ізноў, і мяне ўключылі ў спіс. Ну а далей, у мяне чырвоны дыплом пасля Менскай навучальні, медаль "За баявыя заслугі", палкоўніцкая пасада, першы экзамен па тактыцы, на якім мяне ўжо ніхто не слухаў. "Пяцёрка", і я - слухач акадэміі.

Трэба зрабіць заўвагу аднасна згаданых дваццаці моваў, згадка пра якія мела такое выключнае значэнне. Гэтая лічба хутчэй жаданая, чым рэальная, але так было запісана ў маёй асабістай справе, і таму Цацяратнікаў гэта ведаў. Пацвярджаць веданне гэтых моваў мяне ніхто ніколі не прасіў, а абвяргаць лічбу самому не было ніякай нагоды, мы свае асабістыя справы бачылі вельмі рэдка. Хаця, калі я быў маладзейшым і разумнейшым, то часта чытаў тэкст, разумеў яго без усялякіх слоўнікаў і не ведаў, на якой гэта мове. Было і такое.

Разам са мною паступілі яшчэ тры беларусы: Віктар Бычко (родам з Іўеўскага раёна), Міхаіл Ананіч (родам з Глыбокага), Міхаіл Дубовік (родам з Узды). На 30 чалавек ЗРВшнікаў, такім чынам, было чацвёра беларусаў і ў дадатак яшчэ некалькі выпускнікоў Менскай навучальні.

Да нашага паступлення ў акадэмію тут ужо было ладнае беларускае зямляцтва. Гэта было абумоўлена асаблівасцямі будаўніцтва вайскова-прамысловага комплексу СССР.

"У Калініне (Цвяры) былі размешчаны галоўныя ўстановы Войскаў Супрацьпаветранай абароны краіны: Вайсковая акадэмія СПА і галаўны навукова-даследчы інстытут СПА, а ў Менску ў 50-я гады размясцілася Менская вышэйшая інжынерная радыётэхнічная навучальня, пазней Менская вышэйшая інжынерная зенітная ракетная навучальня. Менскія выпускнікі, як спецыялісты, былі на галаву вышэй выпускнікоў іншых навучальняў, таму многія з іх аказваліся ў НДІ ў Калініне, а многія паступалі ў акадэмію. Пры гэтым частка заставалася ў акадэміі на пасадах выкладчыкаў, беларусы станавіліся начальнікамі вядучых кафедраў і аддзелаў. Большасць з іх - дактары і кандыдаты вайсковых і тэхнічных навук. Само сабой у Калініне склалася беларускае зямляцтва з элітнай часткі афіцэрства, моцнае беларускае лобі. Лідарам і душой зямляцтва быў старшы выкладчык акадэміі, кандыдат вайсковых навук, палкоўнік Вікенці Чорны (родам з Клецка). Актыўныя ролі выконвалі В. Шуверткоў (Клецк), Я. Яўменчык, І. Прыступчык, Г. Казлоў, беларусы з ліку слухачоў акадэміі." Валера Шуверткоў разам са мной закончваў Менскую навучальню, разам мы прыехалі на Урал: я застаўся ў Свярдлоўскай вобласці, а яго адправілі ў Чалябінскую.

Устанаўленне сувязяў паміж беларусамі-завочнікамі і беларусамі выкладчыкамі адбылося неўзабаве пасля паступлення. І тут не лішнім будзе сказаць пра асобу Вікенція Дарафеевіча Чорнага, з якім мяне звёў Валера Шуверткоў. Вікенці на той час слабавата валодаў беларускай мовай, але ён быў шчырым, свядомым беларусам паводле выхавання. Заслуга ў гэтым, найперш, яго бацькі, настаўніка гісторыі адной з клецкіх школаў Дарафея Чорнага. Ён выхаваў шчырымі беларусамі ўсіх сваіх трох сыноў. Так што Вікенці не быў неафітам, беларуская свядомасць сядзела ў ім з маленства. І ён гэтую свядомасць не хаваў, таму вакол менавіта Вікенція Чорнага і групавалася беларускае зямляцтва яшчэ да 1988 года.

Падтрымлівалі беларускі рух у Калініне і многія рускія афіцэры, найперш выпускнікі Менскай навучальні.

У Калінінскім НДІ служыў Гена Сцяпанаў, мой блізкі сябар па навучальні, з якім мы пяць гадоў сядзелі за адным сталом. На адной кафедры з Чорным і Шуверткровым служыў яшчэ адзін мой аднагрупнік па навучальні Валодзя Вінаградаў, да якога я ездзіў у госці ў Князьвалконку пад Хабараўскам. Сцяпанаў і Вінаградаў былі рускімі, але падтрымлівалі з беларусамі самыя цесныя стасункі. Прынамсі, хатні адрас менавіта Сцяпанава, паколькі ён рускі і мог выклікаць меншае падазрэнне, неўзабаве стаў апорным паштовым адрасам для перасылкі беларускай літаратуры ў Калінін.

Тут трэба спыніцца на матывах паводле якіх многія рускія афіцэры падтрымлівалі беларускі нацыянальны рух. Я згадваў ужо, што ў войску нампалітаў не любілі. Па факту гэта была форма антыкамунізму. Абсалютная большасць афіцэраў СПА мела вышэйшую адукацыю, і яны разумелі, што рэальная сіла, якую ніколі не зможа зламаць камуністычная ідэалогія, гэта нацыянальны рухі. Беларускі нацыянальны рух быў для іх блізкі з-за яго памяркоўнасці. Абсалютная большасць гэтых афіцэраў адмоўна ставілася да таго, што беларусы забываюць сваю мову і культуру і падтрымлівала ідэю нацыянальна-культурнага адраджэння Беларусі. Сярод іх не было шавіністаў, альбо мы іх не бачылі.

(Працяг у наст. нумары.)

Рэдактар Станіслаў Суднік

Заснавальнік: ТБМ імя Францішка Скарыны.
Пасведчанне аб рэгістрацыі: № 83 ад 28 чэрвеня 1996 г.
Адрас рэдакцыі: 220034, г. Менск, вул. Румянцава, 13.
Адрас для паштовых адпраўленняў: 231282, г. Ліда-2, п/с 7.
E-mail: naszaslowa@tut.by
http://tbm.org.by/ns/

Рэдакцыйная калегія:
Міхась Булавацкі, Людміла Дзіцэвіч, Вольга Іпатава, Васіль Ліцьвінка, Ірына Марачкіна, Леакадзія Мілаш, Алесь Петрашкевіч, Людміла Піскун, Аляксей Пяткевіч, Уладзімір Содаль, Станіслаў Суднік, Павел Сцяцко, Алег Трусаў.

Аўтары цалкам адказныя за падбор і дакладнасць прыведзенай інфармацыі

Газета надрукавана ў Лідскай друкарні. 231300, г.Ліда, вул. Ленінская, 23.
Газета падпісана да друку 27. 12. 2004 г. Замова № 2381.
Аб'ём 1 друкаваны аркуш. Наклад 2000 асобнікаў.
Падпісны індэкс: 63865.
Кошт падпіскі: 1 мес.- 1340 руб., 3 мес.- 4020руб.
Кошт у розніцу: 290 руб. (у Менску - 310 руб.)